*УДК 821.161.3-3*

**А. А. Нарук**
***Навук. кір. – А. М. Мельнікава, д-р філал. навук, прафесар***

# ФАРМІРАВАННЕ СВЕТАПОГЛЯДУ ІНТЭЛІГЕНТА Ў ПЕРШЫМ ПАКАЛЕННІ Ў РАННЯЙ ПРОЗЕ М. ГАРЭЦКАГА

*У артыкуле разглядаецца спецыфіка культурнага героя беларускай літаратуры і мастацкая інтэрпрэтацыя вобраза інтэлігента ў першым пакаленні ў ранняй прозе М. Гарэцкага. Актуальнасць тэмы абумоўлена тым, што гэта ўніверсалія дазваляе выявіць сувязь паміж ментальным партрэтам прадстаўніка пэўнага народа і тыповым персанажам яго літаратуры, паміж нацыянальнай і сусветнай культурамі. Мэта артыкула – вызначыць адметныя рысы культурнага героя беларускай літаратуры, прасачыць эвалюцыю мастацкага тыпа ў творчасці канкрэтнага аўтара.*

Універсалія культурнага героя з’яўляецца адной з ключавых у сучасным літаратуразнаўстве, культуралогіі і сацыялогіі. Гэта не звычайны персанаж фальклорных ці літаратурных твораў, а носьбіт пэўных маральных каштоўнасцей, светапоглядных установак і мадэляў паводзін, якія становяцца арыенцірам для грамадства. Гэты вобраз – праекцыя народа, у якім ён узнік, захавальнік найбольш істотных набыткаў іх матэрыяльнай і духоўнай спадчыны.

Тэрмін “культурны герой” упершыню ўжыў нямецкі гісторык Курт Брэйзіг. У якасці сіноніма да яго ў працах даследчыка сустракаецца слова “heilbringer”, што перакладаецца як “выратавальнік”. На думку К. Брэйзіга, “культурны герой – міфалагічны персанаж, характэрны для пэўнай групы (культурнай, этнічнай, рэлігійнай), які мяняе свет з дапамогай вынаходніцтва ці адкрыцця” [1].

Феномен “інтэлігента ў першым пакаленні” стаў адным з галоўных аб’ектаў мастацкага даследавання ў творчасці М. Гарэцкага. Матэрыял, асэнсаваны ў прозе, грунтуецца на рэфлексіі і душэўных перажываннях самога аўтара. Пісьменнік паходзіў з сялянскай сям’і, прага да ведаў, самадысцыпліна і добрыя здольнасці дапамаглі яму атрымаць адукацыю. М. Гарэцкі на ўласным вопыце спазнаў усе супярэчнасці гэтага становішча.

Першае пакаленне народнай інтэлігенцыі знаходзілася ў складанай сітуацыі: яе прадстаўнікі ўжо адышлі ад традыцыйнага сялянскага ўкладу, але яшчэ не занялі трывалае месца ў горадзе сярод “паноў”. У ранніх апавяданнях М. Гарэцкі праз аўтабіяграфічных герояў даследуе працэс станаўлення асобы, якая імкнецца захаваць сувязь з

“родным карэннем”, але вымушана шукаць новыя духоўныя арыенціры і шляхі адраджэння Радзімы.

Герой ранніх твораў Гарэцкага – інтэлігент, выхадзец з вясковай хаты, які шукае лепшай долі для сябе і свайго народа ў горадзе. Добрыя змены ў жыцці грамадства ён звязвае з распаўсюджаннем асветы і тэхнічнага прагрэсу. Сваё прызначэнне герой бачыць у тым, каб перадаваць набытыя веды людзям. Аднак яго погляды і наваўвядзенні сям’я і аднавяскоўцы сустракаюць недаверліва, часам з кпінамі і здзекам.

Герой перажывае глыбокі псіхалагічны крызіс таму, што стаў для асяроддзя, дзе ён вырас, чужым, “запанелым”. І ў той жа час студэнт разумее, што для гарадскіх эліт ён застаецца “мужыком”. Эмацыянальны разлад суправаджае і самарэфлексію героя. Юнак разрываецца паміж шчырым жаданнем далучыць да цывілізацыі сваю глухую вёску, адрадзіць заняпалую Беларусь, але сутыкаецца з абясцэньваннем уласных высілкаў з боку людзей, для якіх ён стараецца. Але ўсведамленне цяжкасці абранага шляху не прымушае героя адступіць ад пастаўленай мэты.

Тэму маладой інтэлігенцыі ў творчасці М. Гарэцкага адкрывае апавяданне “У лазні”. У ім змешчаны шэраг ключавых праблем, якія будуць развівацца ў наступных творах: занядбанасць тагачаснай беларускай вёскі, інтэлектуальная і духоўная абмежаванасць яе насельнікаў, пытанне суадносінаў традыцыйнага (народнай культуры) і прагрэсіўнага (навука, тэхніка), нацыянальнага самавызначэння, прызначэння народнай інтэлігенцыі і інш.

Сюжэт апавядання разгортваецца вакол бытавой сітуацыі – паходу ў вясковую лазню. На яе прыкладзе пісьменнік паказвае карэнную змену ва светаўспрыманні героя. Клім Шамоўскі, студэнт апошняга курса каморніцкага вучылішча, прыязджае на калядныя вакацыі ў родную вёску. Перад святам яго сваякі збіраюцца ў лазню і клічуць хлопца з сабой. Клім ўжо некалькі гадоў не хадзіў туды, але пагаджаецца на прапанову.

Як толькі студэнт падышоў да пахілага будынка, ён пашкадаваў аб гэтым рашэнні. Кліма абурае, што побач з вёскай знаходзіцца лес, адабраны ў пана за нявыплату пазыкаў. Аднак жыхары ім не карыстаюцца, каб паставіць добрую лазню. Драўнінай ужо некалькі гадоў гандлююць мясцовыя яўрэі, але насельнікі Мардалысава ахвотней трацяць грошы на гарэлку, чым на нешта карыснае.

Выгляд лазні знутры спалохаў Кліма: цемра, скразнякі, невыносная гарачыня і паўсюдны бруд. У гэты момант герой перажывае эмацыянальнае ўзрушэнне: “Але што ж гэта я? Ці я не радзіўся сам у Мардалысаве, ці сам не купаўся ў гэтай гразі, не бачыў усякага бруду?” [2, с. 22]. У думках Кліма з’яўляецца шэраг непрыемных успамінаў: як

суседзі і сваякі п’юць гарэлку штодня ці лякуюцца ёй, як маці корміць свіней прама ў хаце.

Сутыкненне са старым ладам жыцця – ключавы момант апавядання. Клім раптам пачынае адчуваць сябе іншым, не такім, як асяроддзе, з якога ён выйшаў. Асэнсаванне і прыняцце героем уласнай адметнасці, якая праявілася праз бытавую сітуацыю, і ёсць пачаткам ўсведамлення сябе інтэлігентам.

Гэтую “іншасць” заўважаюць і яго аднавяскоўцы, якія паспяшаліся запісаць студэнта ў паны. Кліма злуе такое стаўленне, бо вучыцца ён пайшоў не дзеля ўласных выгод, а для таго, каб бачыць сваю вёску, а разам з ёю і Беларусь, квітнеючай і багатай.

Студэнт намагаўся далучыць сялян да навукі: прывозіў кнігі, каб чытаць ім вечарамі. Аднак мясцовыя жыхары аддалі перавагу картам і п’яным вячоркам. З насмешкай яны кажуць пра асвету, бо “некалі ім займацца панскім дзелам” [2, с. 25]. А праз уласную абмежаванасць вяскоўцы лягчэй даюць веры прымхам, чым навуцы.

Клім востра рэагуе на кпіны з боку людзей, дзеля дабра якіх ён прыкладаў багата высілкаў. На алтар сваіх ідэалаў хлопец паклаў і душэўны спакой: “А хай бы яны пабачылі боль сэрца і смутак душы ў мяне, прымача ў «панстві» і пасынка вёскі, і яны лепей паехалі б з сахою на родныя палеткі, чымся адарваўшыся ад дзядоўскіх сяліб вісець у новым і невыразным паветры” [2, с. 26].

Герой яшчэ не ведае, як рэагаваць на несправядлівасць у дачыненні да сялян, да свайго становішча, але не можа з ёй змірыцца. І, нягледзячы на моцную прывязанасць да роднага краю, хлопец яго не ідэалізуе. Ён бязлітасна выкрывае заганы грамадства, у якім вырас. Сярод іх – цемрашальства, абмежаванасць, п’янства, грубасць, прымхлівасць.

Герой разумее, што спатрэбіцца нямала сіл, каб адрадзіць занядбаную Радзіму, але не кідае пастаўленай мэты. Ён усведамляе хісткасць свайго становішча: для горада ён чужынец, “мужык”, для вёскі – ганарлівы пан. У душы маладога “нашаніўца” разгараецца канфлікт паміж моцнай любоўю да Беларусі і неразуменнем духоўнага і побытавага жыцця яе насельнікаў. Ён яскрава выявіўся ў перафразаваных радках з паэмы Я. Коласа: “Мой родны край, як ты мне мілы, / Ўцяміць цябе не маю сілы” [2, с. 28].

Ідэйны змест і праблематыка твора знайшлі працяг у апавяданні “Роднае карэнне”, пашырыліся і выявіліся больш выразна. Галоўны герой – студэнт-медык Архіп Лінкевіч, таксама інтэлігент у першым пакаленні. Хлопец атрымаў ліст ад бацькоў, у якім яны скардзяцца на “чартаўшчыну”, што завялася ў новай хаце. Архіп не можа стрымаць іранічнай усмешкі, чытаючы наіўнае пасланне.

Герою прыкра бачыць адсталасць і цемнату роднай вёскі. Ён не можа зразумець, як людзі ў век тэхнічнага прагрэсу даюць веры старадаўнім прымхам. А між тым страх да невядомага, “тагасветнага” скоўвае інтэлектуальны і творчы патэнцыял сялянства. Смешна адукаванаму чалавеку чуць пра тое, што стары вандроўнік сурочыў хату, бо гаспадары не пачаставалі яго, і таму ў будынку ўсхадзіліся чэрці. Але для сына вёскі гэта смех скрозь слёзы.

Адметна, што побыт беларусаў М. Гарэцкі малюе ў непрывабных фарбах, рэалістычна, нават натуралістычна. Праз антытэзу “вёска – цывілізацыя” пісьменнік пацвярджае сваю думку: сялянству тэрмінова неабходна даць асвету, азнаёміць з перадавымі ведамі і тэхналогіямі для паспяховага вядзення гаспадаркі.

Увогуле “беларускае часта паказваецца М. Гарэцкім як цёмнае, забітае” [3, с. 149]. Герой, нягледзячы на тое, што ён вырас у гэтым краі, бачыць Радзіму менавіта такой: “Усё ідзе шпарка ўперад, толькі нашу вёску, як абросшы мохам камень каля шляху, з мясціны не скранеш” [2, с. 43]. Аднак пісьменнік не стварае цалкам песімістычную карціну. На думку М. Гарэцкага, пакуль з сялянскіх хат выходзяць інтэлігенты, якія не выракаюцца народа і ахвяруюць веды і сілы на яго адраджэнне, у беларусаў ёсць надзея на лепшую долю.

Таму Архіп збірае рэчы і едзе дадому, каб разблытаць клубок загадкавых здарэнняў, што адбываюцца ў яго вёсцы. Па прыбыцці студэнт, перакананы рацыяналіст, і сам зайшоў у тупік. Яму не хапіла ведаў і жыццёвага досведу, каб патлумачыць прыроду незвычайных агнёў на балотах, сваіх дзіўных сноў у новай хаце, прычыну, па якой ваўкі не кранулі яго воз. Хлопца цікавіць “першапрычына ўсякае істоты” [2, с. 52], але кнігі не даюць адказаў на яго пытанні.

На шляху сваіх пошукаў герой збліжаецца з традыцыйнай культурай беларусаў. Студэнта здзіўляе, што народ, які называюць “мужыцкім”, “цёмным”, яшчэ шмат стагоддзяў таму сфармуляваў асноўныя філасофскія палажэнні аб быцці чалавека і прыроды, стварэнні і змяненні свету, паняццях жыцця і смерці. Толькі гэтыя веды не надрукаваны на старонках кніг, а жывуць у фальклоры.

Супрацьпастаўленне светапоглядаў інтэлігента Архіпа і дзеда Яхіма гэта не проста канфлікт маладога і сталага пакаленняў, а сутыкненне дзвюх сістэм каштоўнасцей. Мікракосмас вёскі ўвасабляе стары, які жыве па законах прыроды і продкаў. Асновамі яго падыходу да пазнання рэчаіснасці з’яўляецца праца на зямлі і захаванне традыцый. А малады герой, узброены кніжнымі ведамі і новымі ідэаламі, імкнецца пераасэнсаваць гэты свет, знайсці вышэйшы сэнс жыцця чалавека ў ім.

Аднак інтэлігент не выракаецца старажытных ведаў, а стараецца выкарыстоўваць іх. Студэнт вырашыў, што падчас працы доктарам будзе збіраць матэрыялы аб духоўным жыцці беларусаў, займацца вывучэннем

фальклору. М. Гарэцкі паказвае, што разрыў паміж прагрэсіўнымі памкненнямі і традыцыйным укладам адбываецца балюча. Аптымальным шляхам станаўлення маладога інтэлігента пісьменнік бачыць у няспыннай самаадукацыі і сувязі з родным краем. Ён становіцца для героя крыніцай духоўнай сілы і маральных арыенціраў.

Праблему нацыянальнага самавызначэння і становішча інтэлі-гента ў першым пакаленні М. Гарэцкі даследуе ў апавяданні “У чым яго крыўда?”. Твор напісаны ў форме лістоў. У іх галоўны герой – Кастусь Зарэмба, студэнт тэхнічнага вучылішча, – дзеліцца з адрасатамі сваімі пачуццямі, думкамі і мэтамі. У лісце да сябра хлопец прызнаецца, што яго стаўленне да вёскі, а разам з ёй і да ўсяго беларускага, карэнна змянілася.

Раней Кастусь рэдка завітваў у бацькоўскую хату: сваякі бачылі ў ім будучага пана. Кампаніі вяскоўцаў студэнт таксама пазбягаў таму, што часта з яго слоў смяяліся. Адзіным верным сябрам для хлопца засталася кніга, за чытаннем ён бавіў увесь вольны час. Да таго моманту, пакуль не пазнаёміўся з Ганнай – вясковай дзяўчынай. Тое, што яна была малапісьменнай і прытрымлівалася тых жа “хамскіх” поглядаў, як і бацькі Кастуся, не перашкодзіла хлопцу ў яе закахацца.

Праз шчырую прыхільнасць да дзяўчыны-сялянкі герой пачаў іначай глядзець на просты народ, больш зацікавіўся сваім, беларускім. У лісце да сябра ён асэнсоўвае пытанне нацыянальнага самавызначэння, ідэнтычнасці. Студэнт бачыць праблему ў тым, што народная інтэлігенцыя выхоўваецца ў духу замежнай культуры, на няроднай мове, “чужым грунце”. Таму эліта, якая павінна працаваць на карысць свайго краю, выракаецца ўсяго беларускага і прыстасоўваецца да заходняй ці ўсходняй ідэалогіі.

Гледзячы на гэта, герой выказвае спадзяванне, што ў беларусаў з’явіцца ўласны прарок нацыянальнага адраджэння. Студэнт бачыць у народнай культуры свайго занядбанага краю вялікі патэнцыял, які зможа раскрыць і рэалізаваць дэмакратычна настроеная інтэлігенцыя.

Аднак усе ідэалы і планы юнака разбіліся ўшчэнт: з яго намеру ажаніцца з простай сялянкай кпіла ўся вёска, а самога студэнта запісала ў “паны”. Герой апынуўся ў становішчы, калі старое ася-роддзе выраклася яго і ўжо не прызнае сваім, а гараджане бачаць у юнаку “мужыка”.

У выніку ён не можа далучыцца ні да першых, ні да другіх. Герой застаецца ў падвешаным стане паміж двума полюсамі: вёскай і горадам. Задача маладога інтэлігента – знайсці аптымальны шлях развіцця беларускай культуры, паяднаць перадавое і традыцыйнае, сусветнае і нацыянальнае, элітарнае і народнае.

Такім чынам, у ранняй прозе М. Гарэцкага акрэслены асноўныя каардынаты і кірункі фарміравання светапогляду інтэлігента ў першым

пакаленні: вернасць народу, яго традыцыйнаму ўкладу (“роднаму карэнню”), які дае маральную сілу, востры ўнутраны канфлікт з навакольнай рэчаіснасцю і старым асяроддзем.

У зборніку “Рунь” пісьменнік упершыню стварае вобраз героя-інтэлігента, сына вёскі і прымака горада. Станаўленне яго асобы адбываецца ў новых, зменлівых абставінах. Герой упарта шукае новых жыццёвых арыенціраў, сваёй вучонасцю імкнецца быць карысным грамадству і ў гэтым бачыць высакароднае прызначэнне нацыянальнай эліты.

**Спіс літаратуры**

1 Скотт, У. Г. Легенда о Биаге, герое культуры игоротов / У. Г. Скотт. // Asian Folklore Studies. – 1964. – №23. – С. 93–110.

2 Гарэцкі, М. Рунь / М. Гарэцкі. – Мінск : “Мастацкая літаратура”, 1994. – 142 с.

3 Мельнікава, А. М. / Нацыянальна-светапоглядныя каардынаты беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя / А. М. Мельнікава. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2016. – 214 с.